УДК 378.016:93

В. У. Коваль, канд. гіст. навук, асістэнт

# МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНАСЦЬ І ГІСТОРЫЯ Ў ВЫХАВАЎЧЫМ АСПЕКЦЕ

This article is about the wide list of questions, connected with the development of the ties between different sciences. It is given the analysis of the new education technologies, Belarusian and Polish experience. The aim of the article is to explore the synthesis of sciences and the correlation in different methods of historical researches. One of the characteristic features of contemporary Belarusian history is the move to the new forms of research activities. This article is devoted to the development of the ties between history, sociology, literature, ethnography, philology, philosophy, ethic, etc.

**Уводзіны.** Міждысцыплінарнасць дазваляе вывучаць, даследаваць і выкладаць гісторыю Беларусі больш шырока і глыбока. Выкарыстанне міждысцыплінарнага сінтэзу неабходна пашыраць не толькі пры навуковым пошуку, але і пры выкладанні гісторыі. Вывучэнне гуманітарных прадметаў з выкарыстаннем метадаў міждысцыплінарнасці стала неабходным элементам у сістэме сучаснай універсітэцкай адукацыі. Гісторыя павінна фарміраваць у свядомасці студэнта вобраз узаемазвязанага свету, што дазваляе выкарыстоўваць у методыцы выкладання метады іншых дысцыплін.

**Асноўная частка.** На сучасным этапе тэма міждысцыплінарнага сінтэзу з'яўляецца дастаткова папулярнай, аднак слаба распрацаванай. У магчымай мадэлі міждысцыплінарных камунікацый дыскусійнымі застаюцца пытанні навуковай мовы і тэрміналогіі, не цалкам вывучанымі лічацца метадалагічная схема аналіза і агульныя ўмовы інтэрпрэтацыі вынікаў. Неабходна падкрэсліць, што гісторыя пранікае ва ўсе сферы грамадскіх адносін, актыўна ўзаемадзейнічае з эканомікай і паліталогіяй, сацыяльнымі адносінамі, духоўным жыццём, можа вызначацца іх развіццём і сама ўплываць на кожную з гэтых сфер грамадства. Метады гістарычнай навукі даследчыкі аб'ядноўваюць дастаткова часта з метадамі сацыялогіі, лінгвістыкі, філасофіі, культуралогіі, псіхалогіі, этыкі, педагогікі і г. д. Гуманітарныя дысцыпліны абменьваюцца паняційным апаратам, катэгорыямі, практычнымі і тэарэтычнымі вынікамі. Важным укладам у развіццё сінтэзу навук можа стаць пашырэнне зместу саміх падручнікаў разнастайных гуманітарных дысцыплін прыкладамі і заданнямі з выкарыстаннем міждысцыплінарнага метаду даследавання.

На сённяшні дзень можна падкрэсліць тэндэнцыю навуковых супрацоўнікаў і выкладчыкаў да выкарыстанння і рэалізацыі міждысцыплінарнага дыялогу. Становіцца відавочным, што для сучаснага грамадства патрэбны міждысцыплінарныя камунікацыі, а некаторыя кірункі навукі не ў стане сёння развівацца выключна ва ўзаемнай ізаляцыі. Актыўнае выкарыстанне і даследаванне метадаў міждысцыплінарнасці можна знайсці ў навуковых працах па акмеалогіі, дзе асаблівая роля адводзіцца рэалізацыі творчага патэнцыялу асобы пры дапамозе міждысцыплінаранага дыялогу.

Пашырэнне гістарычнага даследавання, з'яўленне новых падыходаў і метадаў, характэрных для іншых навук, атрымалі актыўнае распаўсюджванне з пачатку 1990-х гадоў. Асаблівую ўвагу гісторыкаў выклікалі новыя міждысцыплінарныя накірункі, такія, як «вусная» гісторыя, псіхагісторыя, гістарычная інфарматыка, гісторыя паўсядзёнасці, жаночая гісторыя, гендэрная гісторыя і г. д. Менавіта актыўны міждысцыплінарны дыялог станоўча паўплываў на павышэнне навуковага статусу гісторыі як навукі.

Як вядома, выхаванне і навучанне неразрыўна звязаны паміж сабой. Змена адукацыйных прыярытэтаў непасрэдна паўплывала і на выхаваўчы працэс студэнтаў. Стратэгічнай мэтай вышэйшай школы выступае выхаванне інтэлігентнага, кампетэнтнага спецыяліста, які здольны збудаваць гарманічныя адносіны паміж сабой, грамадствам, навакольным светам і прыродай.

Актыўнае выкарыстанне метадаў міждысцыплінарнага сінтэзу дазволіць шырока ўжываць новыя інавацыйныя методыкі выкладання, а іх неабходнасць у сучасным універсітэце відавочная. Жыццёвыя ўстаноўкі маладога пакалення мяняюцца вельмі імкліва. Аўтар кнігі «Філасофскія праблемы вачыма студэнтаў» трапна адзначыў: «Вучэбныя праграмы не паспяваюць за рытмам жыцця і шмат у чым сыходзяць са стэрыятыпаў пра мэты і задачы навучання, не заўважаюць зменаў з тымі людзьмі, якія сядзяць у студэнцкіх аўдыторыях» [1]. Міждысцыплінарны дыялог дазволіць выкладчыку па-новаму выкладаць матэрыял сучасным студэнтам.

Выкладанне гісторыі ва універсітэце павінна быць праблемным, гэта азначае, што будучым спецыялістам неабходна ведаць увесь спектар праблем сучаснага грамадства, каб яны ўмелі крытычна падыходзіць пры аналізе палітычных працэсаў у дзяржаве. Таму асаблівую ўвагу выкладчык павінен удзяляць навуковым сувязям гісторыі Беларусі і паліталогіі.

Можна прывесці некаторыя прыклады гістарычных тэм, у якіх выкарыстанне міждысцыплінарнасці асабліва неабходна. У выхаваўчым аспекце тэма вайны для выкладчыка гісторыі Беларусі яшчэ працяглы час будзе заставацца

галоўнай. Асабліва моцнае ўражанне на студэнцкую аўдыторыю заўсёды аказваюць сустрэчы з ветэранамі, непасрэднымі ўдзельнікамі Беларускай наступальнай аперацыі «Баграціён», а таксама навуковыя дыскусіі з беларускімі і замежнымі даследчыкамі.

Асобную ўвагу неабходна ўдзяліць святкаванню юбілейных дат у гісторыі Беларусі. Ушанаванне мінулага выхоўвае ў студэнтаў павагу да сваёй гісторыі, адчуванне адказнасці за яе, пераконвае моладзь, што мінулае нельга забываць. Менавіта метады міждысцыплінарнага падыходу дазволяць выкладчыку больш шырока прадставіць дадзеную тэматыку, распавесці як пра гераічныя старонкі гісторыі, так і яе трагічныя падзеі.

Выкладчык можа шырока выкарыстаць магчымасці міждысцыплінарнага сінтэзу пры арганізацыі і правядзенні студэнцкай канферэнцыі. Педагог можа звярнуцца да творчай працы студэнтаў. Напрыклад, прапанаваць напісаць эсэ на актуальную тэму дня, якую можна аднесці адразу да некалькіх дысцыплін.

Важнае значэнне неабходна надаваць самастойнай працы студэнтаў. Акрамя таго, што самастойная работа выклікае актыўнасць студэнтаў, яна носіць яшчэ і індывідуальны, творчы характар. Кожны выкарыстоўвае крыніцу інфармацыі ў залежнасці ад сваіх уласных патрэб і магчымасцяў. Менавіта пры самастойнай працы студэнт абаснавана можа выкарыстаць падручнікі па ідэалогіі беларускай дзяржавы, паліталогіі, культуралогіі і г. д., што дазваляе пашырыць уплыў міждысцыплінарнага падыходу пры выкладанні і выхаванні студэнтаў. У рацыянальным выкарыстанні самастойнай работы захаваны таксама і значны патэнцыял для павышэння матывацыі студэнтаў, асабліва, калі самастойная работа мае добраахвотны характар.

Шырока і плённа выкарыстоўваюцца выкладчыкамі Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта бінарныя лекцыі з запрашэннем выкладчыкаў іншых дысцыплін, круглыя сталы, культурна-асветніцкія канферэнцыі. На прафесійнае і маральнае станаўленне студэнтаў ва універсітэце актыўны ўплыў аказваюць гуманітарныя кафедры – гэта кафедра гіторыі Беларусі і паліталогіі, кафедра філасофіі і права, кафедра замежных моў, кафедра беларускай мовы, на якіх актыўна ўжываюцца міждысцыплінарныя формы выкладання.

Вучэбна-выхаваўчы працэс не павінен абмяжоўвацца акадэмічнай аўдыторыяй. Традыцыйныя формы заняткаў і метадычныя прыёмы не заўсёды могуць зацікавіць студэнтаў. Таму можна ўключыць у навучальны працэс па гісторыі Беларусі музейныя заняткі.

Апрабацыя вынікаў міжнароднага даследавання па тэме міждысцыплінарнага сінтэзу (М. Ялоза, В. Коваль) была праведзена на II Міжнародным кангрэсе «Універсітэцкая адукацыя: вопыт тысячагоддзяў, праблемы, перспектывы развіцця» [2], які адбыўся 14–16 мая 2008 г. у Мінску на базе Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта. У рамках даследавання быў праведзены аналіз эфектыўнасці выкарыстання міждысцыплінарнага сінтэзу гісторыі і літаратуры ў працэсе выкладання. Вынікі дадатковага выкарыстання іншай дысцыпліны выключна станоўчыя. Магчымасць выкладчыка праводзіць паралелі гістарычных падзеяў і літаратуры, суадносіць асобы і вобразы, пашырала матэрыял лекцыі, фарміравала дадатковую зацікаўленасць студэнтаў прадметам. Спробы выкарыстання міждысцыплінарнага падыходу паказалі станоўчы вынік як у студэнтаў Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта, так і ў студэнтаў Варшаўскага універсітэта, што можа сведчыць пра шырокія магчымасці міждысцыплінарнасці розных навук і разнастайных студэнцкіх аўдыторый.

**Заключэнне.** Такім чынам, гісторыя як навука мае шырокія магчымасці ў выкарыстанні міждысцыплінарнага сінтэзу. Ужыванне міждысцыплінарнага падыходу ў працэсе выкладання і выхавання дазваляюць павысіць узровень адказнасці выкладчыка і студэнта ў адукацыйным працэсе, пашырыць сувязі паміж кафедрамі, актывізаваць творчыя здольнасці студэнтаў, павысіць зацікаўленасць дысцыплінай у цэлым.

## Літаратура

1. Васильков, В. Н. Философские проблемы глазами студентов / В. Н. Васильков. – Витебск: ВГУ им. П. М. Машерова, 2007. – 221 с.
2. Коваль, В. У. Міждысцыплінарнае выкладанне гісторыі Вялікай Айчыннай вайны / В. У. Коваль, М. Ялоза // Университетское образование: опыт тысячелетия, проблемы, перспективы развития: тезисы докладов II Международ. конгресса, Минск, 14–16 мая 2008 г.: в 2 т. / МГЛУ. – Минск, 2008. – Т. 2. – С. 39–41.